Газэта рабоча-сялянская моладзі Беларусі
Пролетары ўсіх краёў, яднайцеся!

Чырвоная Зьмена

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 151 (386) Пятніца, 7 студзеня 1927 г | Выходзіць тры разы на тыдню у чацьвер, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90? | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, Чырвонай Зьмена, Менск, Комсам. 35.

Гарачае комсамольскае прывітаньне Х-му зьезду КП(б)Б!

Мы будуем соцыялізм!

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Крыніцкі

Зьезд заслухаў політычную справаздачу Цэнтральнага Камітэту.

З найвялікшай самакрытыкай Цэнтральны Камітэт выклажыў перад зьездам работу мінулага пэрыоду і азіраючыся назад намеціў асноўныя шляхі на будучае. Якія асноўныя дасягненьні КП(б)Б за мінулы пэрыод.

Політыка — гэта концэтраваная экономіка. Ставячы перад сабою політычныя задачы, мы ні на хвіліну не забывалі тае бясспрэчнае ісьціны, што без узмацаваньня пролетарскай базы, прамысловае базы нашае краіны, без павялічэньня тавараабароту гораду і вёскі нам трудна будзе замацаваць саюз рабочае клясы з сялянствам, замацаваць дыктатуру пролетарыяту. Мінулы год быў годам разьвіцьця вытворчых сіл краіны, павялічэньня соцыялістычных элемэнтаў у нашай гаспадарцы і павялічэньня зваротнасьці ўсяго гаспадарчага організму. Пад няўхільным узьдзейнічаньнем нашай політыкі, вучотам, рэгуляваньнем усіх процэсаў праходзіла гаспадарчае будаўніцтва Беларусі. Элементы стыхійнасьці яшчэ не пераможаны, але мы за мінулы год навучыліся апаноўваць і накіроўваць стыхійныя процэсы ў русло плянамернай пролетарскай экономічнай політыкі.

Пад нашым узьдзейнічаньнем усе апараты адміністрацыйныя, гаспадарчыя, коопэрацыйныя і грамадзкія працавалі для павялічэньня соцыялістычнага накапленьня, для павялічэньня ролі прамысловасьці ва ўсім гаспадарчым сэктары краіны. К 10-му зьезду мы можам з упэўненасьцю сказаць, што колькасьць абагуленых элемэнтаў расьце няўхільна, што мы ў нашай адсталай у экономічных адносінах краіне пры дапамозе ўсяго Саюзу можам будаваць соцыялізм. І гэта ўваходзіць у сьвядомасьць соцен, тысяч, мільёнаў працоўных мас, якія, перамогшы труднасьці мінулага, павялічыўшы свой дабрабыт, вераць у перамогу сучаснага і якія ў асобе комуністычнай партыі бачаць правадыра і організатара лепшага жыцьця, аб якім мы марылі, якое мы зараз ажыцьцяўляем.

Расьце аўторытэт партыі ў вёсцы. Апіраючыся на беднату, організоўваючы яе, узмацоўваючы яе блёк з серадняком проці вярхушачнай часткі вёскі, партыя залажыла моцны фундамант далейшае работы, стварыла навакол сябе перадавы савецкі вясковы актыў і перамогшы на перавыбарах саветаў, зараз робіць нізавую ячэйку савецкае ўлады у вёсцы сродкам пролетарскай дыктатуры. У мінулым, пры старым ладзе малейшае палепшаньне сялянскага жыцьця было зьвязана са зьдзекамі, лаянкаю над народнымі масамі. Зараз сяляне разумеюць, што савецкая ўлада робіць усё неабходнае для таго, каб палепшыць жыцьцё сялян далучыць іх да гарадзкое культуры. Сяляне-палякі, якія в тым зьезд адзначылі перавагу савецкага ладу перад буржуазна-капіталістычным.

Мы расьцём. На базе гаспадарчага росту шырока разгарнулася актыўнасьць працоўных мас, шырока разгарнулася беларуская культура, культура ўсіх нацыянальнасьцяй краіны. Беларуская мова выйшла на эўропейскую арэну, нашы культурныя ўстановы—гонар рабочых і сялян усіх нацыянальнасьцяй. За кароткі тэрмін маладая рэспубліка магла заснаваць фундамант высока- навуковых установ і што самае паважнае, самае галоўнае—накіраваць усё культурнае будаўніцтва ў русло пролетарска-клясавага зьместу, аздабляючы зьверху і данізу школьную сетку, хату-чытальню і тэатр комуністычнымі ідэямі.

Мы расьцём. Наша нацыянальная політыка, якую мы праводзім па-ленінску, дала нам значныя вынікі ў справе ўзмацненьня савецкага будаўніцтва. Там за рубяжом пануе фальш, нацыянальны прыгон, зьдзекі, тут у краіне саветаў—воля для ўсіх нацыянальнасьцяй, культурны росквіт. Цэнтральны Камітэт з вялікай адказнасьцю зможа падагуліць нашу работу ў галіне нацыянальнай політыкі, як політыку інтэрнацыянальную. Няма, ня было ў нашых шэрагах, у нашай рабоце нацыянальнай абмяжованасьці. Мы разумеем, што на падставе некаторага адраджэньня прыватна-капіталістычных элемэнтаў адраджаецца нацыянал-шовінізм, але мы ведаем, што мы маем патрэбную сілу, што востра адточаны меч ваяўнічага матар'ялізму, ленінізму зможа асадзіць рэшткі заскарузлага вялікадзяржаўнага шовінізму і нацыянал-дэмократызму.

Мы можам, падводзячы вынікі мінулага пэрыоду, канстатаваць сапраўднае бальшавіцкае адзінства КПБ. Партыя разам са ўсёй УсеКП дала рашучы адпор опозіцыйнаму блёку, загартоўвалася ў барацьбе, папаўняла свае шэрагі найлепшымі пролетарыямі і к канцу мінулага году прыняла ў свае шэрагі новыя далучаныя да КПБ Гомельскую і Рэчыцкую організацыі з большавіцкімі традыцыямі работы. Вось якія асноўныя вынікі політычных дасягненьняў мінулага пэрыоду.

КП(б)Б можа бадзёра глядзець ў будучае. Яна за мінулы пэрыод паказала сапраўднае большавіцкае разьвіцьцё, яна ў будучым пакажа найвялікшыя перамогі ў справе ўтварэньня комуністычнае грамады.

Хроніка працы зьезду.

I. Вячэрняе пасяджэньне 3-га студзеня.

Зьезд абраў прэзыдыум, сакратарыят, рэдакцыйнаю і мандатную камісіі і зацьвердзіў парадак дню і рэглямант працы.

Тав. Крыніцкі зрабіў політычную справаздачу, якая зацягнулася блізка да 3 з паловай гадзін. Сканчэньне было перанесена на 4-І.

II. Ранішняе пасяджэньне 4-І.

1) Зьезд заслухаў канец справаздачы т. Крыніцкага;

2) Былі заслуханы прывітаньні ад бабруйскіх рабочых, гомельскіх чыгуначнікаў і беспартыйных сялян палякаў;

Тав. Галадзед зрабіў організацыйную справаздачу ЦК КПБ, канец якой быў перанесен на ІІІ пасяджэньне

III. Вячэрняе пасяджэньне 4-І.

1) Быў заслухан канец справаздачы т. Галадзеда;

2) Зьезд віталі рабочыя менскай электрастанцыі, піонэры і рабочыя Меншвея;

3) Тав. Чарнушэвіч зрабіў даклад рэвізійнай камісіі;

4) Пачаліся спрэчкі па докладах т.т. Крыніцкага, Галадзеда і Чарнушэвіча.

Прыезд т. Петэрса П. Х.

Для удзелу ў працах Х-га ўсебеларускага зьезду КПБ прыехаў з Масквы т. Петэрс П. Х.—член ЦКК

Крывавы тэрор у фашысцкай Літве.

Хай жыве компартыя Літвы! Хай мацней гартуюцца яе шэрагі.

Процэс 6-ці ў Коўні.

У Ковенскім прысьпешаным палявым судзе пачаўся разгляд справы 6-ці чалавек, абвінавачаных у актыўнай комуністычнай дзейнасьці.

Прокурор патрабуе для ўсіх падсудных кары сьмерці.



Растрэл 4-х комуністаў.

У Коўні згодна пастановы ваенна-палявога суду растраляны абвінавачаныя ў падрыхтоўцы да паўстаньня 4 камуністы: Пажэла, Грэйфэнбэргэр, Кенэрыс і Чорны.

* * *

Першы раз я спаткаў тав. К. Пажэлла, вясной 1919 г. у Панявежы, ў пэрыод самога распалу грамадзянскай вайны. Калі рабочыя і сяляне Літвы несьлі вялікія страты ў барацьбе з наступаючымі батальёнамі нямецкіх жалезных дывізій і літоўскіх белагвардзейскіх банд.

Шавельскі і частка іншых паветаў, ўжо былі заняты белалітоўцамі. Тав. К. Пажэлла ў моманты нашых паражэньняў і няўдач на фронце заўсёды трымаў сябе стойка і заўсёды ўмеў знайсьціся каб выйсьці з самага цяжкага становішча. Таварышы да яго слоў і прапаноў заўсёды адносіліся з вялікай увагай. Ён ня любіў казаць лішніх слоў і да ўсёй працы ён адносіўся з надзвычайнай сур'ёзнасьцю.

Рабочыя і сяляне Літвы ў пэрыод організацыі саветаў ў Літве (1919 г) ведалі К. Пажэлла, як адданага працоўніка.

Па даручэньню партыі Пажэлла заўсёды выконваў найадказьнейшыя заданьні і сваёй працай быў прыкладным для іншых таварышоў.

У канцы 1919 г. я спаткаў Пажэлла ўжо пад мянушкай „Адольф" у г. Коўна, калі ён выконваў працу по організацыі нелегальных выданьняў компартыі Літвы.

Пры вельмі цяжкіх умовах падпольля Адольф надзвычайна добра справіўся з заданьнямі па організацыі нелегальнай друкарні. Бесперабойна веў нелегальную выдавецкую працу. Адольф прымае актыўны ўдзел у стварэньні ўсяго падпольнага апарату комуністычнай партыі Літвы, т. Адольф быў ня толькі добрым конспіратарам але і добрым організатарам-кіраўніком, які ўмеў правільна накіроўваць працу кожнага асобнага партыйца. Гэтым самым хутка пашырыў і ўзмацніў паўсямесна партыйную працу і заваяваў да сабе пашану ўсіх сяброў партыі.

* * *

З таварышом Грэйфэнбэргэрам Юзэфам мне прышлося ўпярвыя спатканца ў г. Коўні, ў маі 1920 г. Там ён быў партыяй пастаўлены на адказную організацыйную працу па стварэньню комсамольскай організацыі Літвы. Тав. Юзэф адзначаўся нявычэрпанай энэргіяй у сваёй працы. Умеў надзвычайна добра канспірыравацца. Быў сьмелы і рашучы ва ўсіх сваіх дзеяньнях.

Літоўская ахранка (жвальгіба) на працягу 6 год не магла яго выкрыць. Ня гледзячы на перасьледаваньні, ён вельмі часта бываў у самых далёкіх раёнах провінцыі і там дапамагаў праводзіць організацыйную і іншую — комсамольскую працу. Ен ня ведаў змору ў працы—быў адным з актыўнейшых будаўнікоў ўсяго нелегальнага комсамольскага апарату Літвы.

Таварышы Адольф і Юзэф сваёй бяспрыкладнай працай на працягу цэлага шэрагу год пры вельмі цяжкіх нелегальных умовах навучылі многія сотні новых працаўнікоў, як трэба організоўваць і весьці працу па барацьбе з капіталам, каб здабыць канчатковую перамогу.

Імёны слаўных таварышоў згінуўшых на рэволюцыйнай варце—Адольфа і Юзэфа, будуць памятаць рабочыя і сяляне ўсяго сьвету. Пачатая імі справа—рабочымі і сялянамі Літвы—хутка будзе даведзена да канца.

Пятрас.

Язэп.

«Мы рождены революцией. Вместе с нею растем и развиваемся».

Гэтыя словы з маніфэсту ЦК Комсамолу Літвы і Беларусі ў лютым 1919 годзе адносяцца цалкам да аўтара гэтага маніфэсту—таварыша Язэпа Грэйфэнбэргэра. Ён рос разам з рэволюцыяй, але вельмі рана быў бязьлітасна вырваны літоўскімі катамі з шэрагаў яе барацьбітоў.

„Іх было два Язэпы, два непадзельныя таварышы па рэволюцыйнай барацьбе: Язэп Флакс і Язэп Грэйфэнбэргэр. Абодва былі першымі організатарамі рэволюцыйнай моладзі ў Заходняй вобласьці, сябрамі прэзыдыуму першага ЦК Комсамолу Літвы і Беларусі.

Першы з іх, больш старэйшы, Язэп Флакс загінуў ад рук белапалякаў у дні вялікай барацьбы за вызваленьне Беларусі і Літвы ад польскіх захватчыкаў. Недалёка ад Варшавы ў часе мітынгу, у горадзе Янаве, які быў вызвалены чырвонымі вайскамі, начальнік політаддзелу 8 й дывізыі тав. Флакс быў схоплены нечакана наспеўшымі белапалякамі і зьверскі імі забіты. Так гэроічна згінуў старэйшы Язэп ўлетку 1920 году.

Прашло больш 6 ці гадоў. За гэтыя гады другі Язэп, які застаўся жывым, працягваў агульную справу рэволюцыйнай барацьбы ў найцяжэйшых умовах нелегальнай партыйнай працы.

Язэп Грэйфэнбэргэр, які ўвашоў у рэволюцыю проста ад ціскоў мэталічнага заводу „Віліі", пачаў сваю рэволюцыйную працу мала вопытным юнаком. Але на рэволюцыйнай працы Язэп вырас. З сьцен невялічкай рэдакцыйнай каморкі Невельскага павятовага „Молата" вышаў на шырокі шлях працы сярод моладзі моцны організатар, вопытны пропагандысты, стойка адданы барацьбіст за справу комунізму.

Бурныя фронтавыя дні грамадзянскай вайны на Захадзе прымушалі Язэпа Грэйфэрбэргэра пераяжджаць з аднаго вучастку працы на другі. Разам з рэволюцыяю, якая наступала то наперад, то часова адступала,—Язэп будуе Комсамол у Менску, Смаленску, Вільні, Коўна і ў шмат іншых гарадох і мястэчках Беларусі і Літвы.

Язэп забіты літоўскімі фашыстамі ноччу пасьля „нараджэньня хрыстова".

Успамінаю, як ён зьбег такога-ж трагічнага ўдзелу ў дні „сьвятога вялікадня" ў 1919 годзе. Дзіўнае супадзеньне! Буржуазія, як відаць, пад прыкрыцьцем сваіх рэлігійных сьвят рыхтуе самыя жудасныя, самыя нечаканыя напады сваім клясавым ворагам.

Так у дні вялікодных сьвят у 1919 г. белапалякі ўварваліся ў Вільню, зрабіўшы амаль пагалоўнае зьнішчэньне комуністых, комсамольцаў і лепшых рабочых чырвонай сталіцы Савецкай Літвы і Беларусі. Гэты нямінуемы разгром быў адбіты атрадам Віленскіх комсамольцаў, на чале якога стаў неўстрашымы Язэп.

Паднятыя сярод ночы віленскія комсамольцы, якія абучаліся па ўсім правілам мастацтва ваеннай справе, кінуліся да сваіх казарм супроць белапольскіх налётчыкаў. Тыя пасьпелі ўжо захапіць у свае рукі вакзал і бліжэйшыя вуліцы да цэнтру гораду. Комсамольцы біліся, як храбрацы і адбілі першыя, самыя небясьпечныя атакі ворага. Язэп Грэйфэнбэргэр знаходзіўся ў першых шэрагах на лініі агню. Ен тады ўцалеў, каб акунуцца зноў з галавою ў падпольную работу.

Язэп не адзін раз пераходзіў праз лінію фронтаў, калі езьдзіў дэлегатам на першы міжнародны конгрэс Комінтэрну моладзі ў Бэрлін, калі прыяжджаў нелегальна з «дэмократычнай» Літвы на конгрэсы і пленумы Комінтэрну ў Чырвоную Маскву.

6 з лішнім гадоў кіпеў у рэволюцыйнай працы наш дарогі Язэп, 6 год ён няўтаміма організоўваў рэволюцыйную моладзь, рабочых і сялян у маленькай Літве, удачна хаваючыся ад узрокаў і цепкіх лап літоўскай ахранкі. Ня раз вырываўся ён з яе турам, ня раз уцякаў ад сьмярцельнай небясьпекі.

„Чорныя коляды" сказаліся для яго і для нас крывавымі. Палачы схапілі яго і бязьлітасна справіліся з ім. Ён пашоў ад нас на заўсёды, але справа яго, яго прыгожае рэволюцыйнае жыцьцё застануцца ў нашай памяці на заўсёды.

Таварышы, зьяднаемся яшчэ больш навокал тае справы, пад сьцягам якой жыў, змагаўся і памёр Язэп Грэйфэнбэргэр.

А. Ахманаў.

Масква
студзень 1927 г.

Да новых перамог мы ідзем і прыдзем пад кіраўніцтвам партыі.

ГУТАРКІ З КОМСАМОЛЬЦАМІ—ДЭЛЕГАТАМІ ДЗЕСЯТАГА ЗЬЕЗДУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ.

Што кажа тав. Шаліма.

(Менская арганізацыя).



—Побач з вялікім узростам Менскай арганізацыі (10.000 чал.) у яе шэрагах павялічыўся партыйны асяродак.

Ня гледзячы на тое, што зараз праводзіцца праца па звальненьню перарасткаў і ўходу значнай часткі комсамольцаў-партыйцаў у Чырвоную армію ёсьць якасны і колькасны ўзрост актыву нашай арганізацыі.

Адначасова з гэтым павялічылася парт'ядро ў актыве. Значна палепшылася і парткіраўніцтва ў ячэйках. Заўважваецца актыўны ўдзел партпрымацаваных у абгаварэньні пытаньняў комсамольскай працы.

Асабліва прыёмным зьявішчам трэба адзначыць, што наша арганізацыя ў асноўным зразумела задачы ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве і працы па правядзеньню рэжыму эканоміі. Мы маем значнае зьмяншэньне прагулаў на вытворчасьці, павялічэньне ўдзелу ў працы вытворчых нарад і камісій.

За адзін год—на 100%.

(Віцебская арганізацыя КСМ).



Тав. Пыканаў.

— У нас у Віцебскай арганізацыі комсамолу, узрост партыйнага асяродку ў гэтым годзе надзвычайна вялікі, калі мы ў мінулым годзе адставалі ад сярэдняга проценту арганізацый, дык цяпер мы ўжо перайшлі вышэй сярэдняга проценту. —Узрост партасяродку ў процантных суадносінах павялічыўся ў нас больш чымся ў два разы.

— Узрост партыйнага асяродку адбіўся на практычнай працы, у сэнсе ўзмацненьня парткіраўніцтва. Але ёсьць і недахопы. Справа ў тым, што партыйцы-комсамольцы ў большай сваёй частцы вылучаюцца на грамадзка-савецкую працу. З прычыны чаго яны адрываюцца ад комсамольскай працы.

— Таксама павялічылася колькасьць партыйцаў у складзе кіраўнічага актыву. Але, аднак, ня гледзячы на гэта мы лічым, што партыйны асяродак нашай арганізацыі ўсё ж недастатковы. Віцебская акруговая арганізацыя, у якой 39 проц. рабочай моладзі, бязумоўна павінна мець больш высокі процант партыйнага асяродку.

— Яшчэ недахопам трэба лічыць нераўнамернае разьмяркаваньне партыйцаў у сельскіх раёнах. Ёсьць такія ячэйкі, дзе зусім адсутнічае партасяродак. Гэтым самым ускладняецца выкананьне курсу—на сакратара ячэйкі комсамольца-партыйца.

Дзяўчаты і батракі—ў партыю.

— Ну як справа з уцягненьнем у партыю дзяўчат і батракоў?

— На гэта трэба адказаць, што ўцягваньне іх у партыю ідзе слаба, з прычыны недастатковай палітычнай падрыхтаванасьці.

... — У адносінах перадачы перарасткаў у партыю, — справа ў нас стаіць досыць добра. Большасьць з іх—падрыхтаваны і передаюцца ў партыю.

Выключэньнем зьяўляюцца перарасткі ячэек навучальных устаноў.

— Побач з узмацненьнем партыйнага кіраўніцтва, праз павялічэньне парт'асяродку, маецца ўзмацненьне кіраўніцтва збоку партыйнай арганізацыі—непасрэдна.

Партыйныя ячэйкі зараз звяртаюць больш увагі на якасьць працы партпрымацаваных Гэта дае належныя вынікі.

* * *

(Гомельская арганізацыя КСМ)



Тав Яблонскі.

Гомельская арганізацыя налічвае ў сваіх шэрагах каля 6000 чалавек. Партыйны асяродак складае 13 процантаў, узрост якога ішоў за лік вытворчых ячэек і комсамольцаў вёскі. Аднак за лік вёскі гэты ўзрост ідзе слабей

У нашай акрузе парткіраўніцтва праводзіцца ня так, як ў другіх акругах праз партпрымацаваных, а праз бюро ячэек КПБ(б), якія заслухоўваюць асобныя пытаньні комсамольскай працы, прычым большасьць сакратароў ячэек ЛКСМБ сябры бюро зьяўляюцца сябрамі бюро ячэек КПБ(б).

У вёсцы, у шмат парт'ячэйках зусім адсутнічае парт-кіраўніцтва сельскімі комсамольскімі ячэйкамі. Але ёсьць такія ячэйкі КПБ(б), якія кіруюць працай ячэек і прыцягваюць комсамольцаў да партыйнай працы.

* * *

(Барысаўская арганізацыя КСМ).



Тав. Зіноўеў.

— Наша Барысаўская арганізацыя комсамолу з 4.127 сябрамі і 147 кандыдатамі, мае партыйны асяродак у 85 сяброў і 219 кандыдатаў партыі. У аснове сваёй узрост парт'асяродку —ідзе за лік комсамольскай рабочай часткі і ў апошнія часы значна за лік комсамольцаў вёскі.

Вось у нас заўважваліся такія адмоўныя моманты ў парт'асяродку, калі комсамольцы-партыйцы, яшчэ не дасягнуўшыя 23-гадняга ўзросту, ужо выказвалі нежаданьне працаваць у комсамоле і зьяўляліся пасыўнымі.

З боку дзяўчат трэба адзначыць, што мы маем недастатковы ўзрост іх у складзе партыйнага асяродку.

Цяпер аб перарастках. Іх большая частка перадана ў партыю. Але ёсьць і такія, што дзякуючы сваёй непадрыхтаванасьці перайсьці ў партыю не змаглі.

Такія ў нас пераходзяць на грамадзка-савецкую працу і ад комсамолу аслабаняюцца.

У адносінах насычанасьці парт'асярэдзіннай комсамольскага актыву мы маем такія лічбы:

У складзе бюро ячэяк маецца—11.56 проц., райкомаў—75 проц. і АК.—90 проц.

* * *

(Слуцкая арганізацыя)



Тав. Сальцэвіч.

Наша арганізацыя маладая Парт'асяродак ня вельмі вялікі (4,6 проц.) Яго ўзросту перашкаджае адсутнасьць паручыцеляў у вёсцы. З прычыны чаго можна выпадкова сустракаць моманты настрояў выхаду з комсамолу.

Побач з павялічэньнем удзельнай вагі парт'асяродку ў арганізацыі ёсьць моманты адрыву і недаацэнкі комсамольскай працы, на грунце перагружанасьці партыйна савецкай працай.

Пасьля вывучэньня пытаньня аб парткіраўніцтве і правядзеньня нарад, адчуваецца што па ўсім раёнам, узмацнілася кіраўніцтва з боку парт'ячэек.

З боку АК КП(б)Б была зьвернута сталая ўвага і дадзен шэраг паказаньняў мясцам. Цяпер задачы зводзяцца да праверкі праламаньня дадзеных дырэктыў.

* * *

(Магілёўская арганізацыя КСМ)



Тав. Красоўскі.

Усяго ў нашай арганізацыі каля 5000 чал. (ня лічучы вайсковых комсамольцаў).

Партасяродак складае 9,5 проц. З часу другой акруговай канфэрэнцыі, партасяродак у Магілеўскай арганізацыі павялічыўся на 2,1 проц.

У складзе сакратароў ячэек процант комсамольцаў-партыйцаў дасягае ад 16-37 проц.

На апошняй партыйнай конфэрэнцыі, дзе стаяла пытаньне аб працы комсамолу, была зьвернута вялікая ўвага абгаварэньню пытаньняў комсамольскай працы, у прыватнасьці, пытаньню парткіраўніцтва.

На гэтай конфэрэнцыі прысутнічала звыш 30 комсамольцаў-партыйцаў. З іх каля 10 чалавек было непасрэдна ад варштату.

Акругком партыі ў апошнія часы абгаварыў шэраг пытаньняў комсамольскай працы. Дадзена шэраг практычных прапаноў, якія цяпер пакладзены ў аснову працы АК ЛКСМБ.

Ёсьць значнае паляпшэньне.

(Полацкая арганізацыя КСМ).



Тав. Верамейчык.

Усяго ў арганізацыі каля 3.809 ч., з іх партасяродак складае 5,9 проц. Узрост ідзе роўнамерна як у горадзе за лік рабочай часткі, так і ў вёсцы за лік сялянска бядняцкай моладзі.

Слаба з перадачай у партыю батракоў і дзяўчат-сялянак. З часу 14 га зьезду УсеКП(б) ёсьць значнае паляпшэньне партыйнага кіраўніцтва з боку АК КПБ(б) і РК КПБ.

Але яшчэ нязначны зрух у паляпшэньні парткіраўніцтва, з боку нізавых парт'ячэек. Асабліва гэта адчуваецца ў вёсцы. АК за мінулы год ставіў сабе шэраг пытаньняў комсамольскай працы. Цяжкасьць паляпшэньня парткіраўніцтва ў тым, што комсамольскіх ячэек значна больш чымся парт'ячэек. Так на вёсцы 12[...] ячэйкі КСМ маюць навакол сябе толькі 58 партыйных ячэек. 73 ячэй[кі] непасрэднага кіраўніцтва ад ячэ[ек] КПБ не атрымліваюць. РК КПБ гэт[ыя] ячэйкі сваім кіраўніцтвам таксама [не] ахопліваюць.

Парт'асяродак у некаторай св[аёй] частцы на комсамольскай працы [не] адчувае адказнасьці і заўважвае[цца] імкненьне ўнікнуць ад комсамольск[ай] працы і комсамолу.

Галоўнай нашай задачай на [да]лейшае зьяўляецца: дабіцца ў спр[аве] парткіраўніцтва большай конкр[этна]сьці і большай практычнай д[апа]могі ад парт'ячэек.

Што маем—і далейшыя задачы.

(Калінінская арганізацыя КСМ).



Тав. Карчык

Уся ўвага арганізацыі за апошні час накіроўвалася ў напрамку павялічэньня партыйнага асяродку.

У арганізацыі ўсяго 5.019 чал. Парт'асяродак узрос ад 4,5 проц.—у 1925 г. да 7,1 проц. у сьнежні 1926 г.

Апошні пленум АК выказаўся за неабходнасьць пэрыядычнага прыцягваньня да комсамольскай працы — парт'асяродку, лічучы актыўную працу ў комсамоле, як партыйны абавязак.

Па ўсім раёнам былі праведз[ены] нарады партпрымацаваных супо[льна] з парт'асяродкам.

Формамі партыйна-пролетарск[ага] кіраўніцтва ў умовах нашай Калі[нін]скай акругі мы лічым:

Паляпшэньне працы і павялічэ[нь]не ўдзельнай (палітычнай) вагі [вы]творчых ячэек.

Паляпшэньне працы сярод ба[трац]кай моладзі і рашучы курс на а[кты]візацыю парабка і рабочага.

Узмацненьне тэмпу падрыхт[оўкі] пролетарскай часткі арганізацыі [для] ўступленьня ў партыю, лі[чучы] парт'асяродак як аснову парты[йна]-пролетарскага кіраўніцтва ў ор[гані]зацыі.

Узмацненьне тэмпу высоўва[ньня] рабочых і парабкоў, комсамо[льцаў] партыйцаў на актыўную комсам[оль]скую працу.

Выконваньне лёзунгу «сак[ратар] комсамольскай ячэйкі—сябра, [або] кандыдат КПБ».

Парткіраўніцтва значна палепшылася.

(Аршанская арганізацыя ЛКСМБ).



Тав. Варончанка.

— Што мы рабілі для таго, каб павялічыць і ўзмацніць наш партасяродак?

Аршанская арганізацыя налічвае ў сваіх шэрагах звыш 7 000 чал. Парт'асяродак 8 проц Партыйны асяродак узрос параўнаўча з мінулым годам на 4 проц.

Мы практыкавалі арганізацыю гурткоў па вывучэньню статуту і праграмы партыі. Высунулі пытаньне як па лініі комсамольскай арганізацыі так і па лініі партыі—аб уцягненьні старэйшых комсамольцаў і асабліва актыву ў жыцьцё партыйных ячэек, прыцягвалі комсамольцаў да рэгулярнага наведваньня партыйных сходаў, прыцягвалі тава[рышоў] да выкананьня партыйных з[адань]няў і г. д.

Пакуль што слабавата ідзе [павя]лічэньне парт'асяродку за лі[к дзяў]чат і батракоў.

Партыйнае кіраўніцтва ў [нашай] арганізацыі праводзіцца праз [парт']асяродак, які ў сваёй боль[шасьці] выконвае актыўную працу ў [комса]мольскіх ячэйках і камітэтах, напрыклад, у складзе райкома[ў ком]самолу — лік партыйцаў-ком[самоль]цаў перавышае колькасьць [комса]мольцаў.

Мы яшчэ да гэтага часу н[е ахапі]нулі ўсіх комсамольцаў пар[тыйцаў] у актыўную працу комсамо[льскай] арганізацыі. Ёсьць такія выпад[кі, калі] пераведзены ў партыю комс[амолец] адрываўся ад комсамолу.

Наогул, парткіраўніцтва ў Аршанскай арганізацыі зна[чна па]лепшылася. Гэта выявілася [ў тым,] што комсамольцы пачынаюць [ціка]віцца і цікавіцца пытаньнямі [пар]тыйнай працы. Гэта таксама [выя]вілася ў тым дружным і [...] адпоры, які дала аршанская моладзь ў адказ на вылазку [...]

Павялічваецца вага арганізацыі.



Тав. Марчык.

(Мазырская арганізацыя КСМ).

Наша арганізацыя ўсяго налічвае—4000 чал. (гэта ня лічучы вайсковых комсамольцаў). Процант парт'асяродку на сьнежань 1925 г. складаў 7,1 проц. А ў сучасны момант ня гледзячы на тое, што частка актыву (каля 80 чал. партыйцаў-комсамольцаў) пашло ў Чырвоную армію, парт'асяродак узрос да 8,9 проц.

Акругком КПБ(б) два разы разглядаў, аналізіраваў, узрост парт'асяродку і даваў спэцыяльныя дырэктывы адносна парткіраўніцтва. Гэта дырэктыва праламалася па ўсёй партыйнай арганізацыі—і ў сувязі з гэтым значна павялічваецца партыйны асяродак, галоўным чынам за лік рабочай моладзі і ў значнай меры за лік вясковага актыву.

За тыдзень да Х-га зьезду КПБ(б), акругком партыі, які праводзіў праверку выкананьня дадзеных дырэктыў,—адзначыў, што ў адносінах парткіраўніцтва комсамолам у акрузе ёсьць значныя дасягненьні. Вось толькі слаба ідзе ўзрост парт'асяродку за лік дзяўчат.

Перашкаджае ўзросту парт'ядра наступнае:

— адсутнасьць паручыцеляў. Ёсьць шмат комсамольскіх ячэек ня маючых навакол сябе партыйных ячэек;

— комсамольцы недастаткова падрыхтоўваюць сябе да паступленьня ў партыю.

Кепска абстаіць справа з комсамольцамі—перарасткамі іншымі па сацыяльнаму становішчу. Тут рэгуляваньне сацыяльнага складу партыйнымі комітэтамі, неабходнасьць навучыцеляў з вялікім партстажам—стварае тое, што некаторых з іх прыходзіцца аслабаваць ад комсамолу.

Удзельная вага парт'асяродку.

Раней—год таму назад удзельная вага парт'асяродку была вельмі малая. Парт'асяродак не адчуваў сябе асноўным кіраўніком—праз які партыя ажыцьцяўляе свой уплыў і кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй. У сучасны момант, калі мы правялі некалькі раз нарады партыйцаў—комсамольцаў з партпрымацаванымі, парт'асяродак адчувае адказнасьць за сваю працу ў комсамоле, за выключэньнем некаторых нязначных выпадкаў, калі асобныя комсамольцы неўразумелі яшчэ тых задач, якія былі на іх ускладзены партыяй.

Значна палепшылася і ўзмацнілася кіраўніцтва з боку парт'ячэек—комсамольскімі ячэйкамі, асабліва ў горадзе. У вясковых ячэйках яно яшчэ ня зусім дастаткова, і то з прычыны слабасьці ячэек КПБ(б), альбо іх адсутнічаньню ў іншых месцох.

Райкомы КПБ(б) практыкуюць прымацаваньне асобных партыйцаў да тых комсамольскіх ячэек, дзе адсутнічаюць парт'ячэйкі.

У сувязі з узмацненьнем парт'асяродку і парткіраўніцтва, наша комсамольская арганізацыя набыла большую грамадзка-палітычную вагу, як сярод насельніцтва, так і ў партыі.

Замест слоў--жывая справа!

За канкрэтную працу ячэек!

Грош цана тым комсамольцам, якія справу пераварочваюць у „гаварылку“.

Мая праца ў сельсавеце.

(Вёска Уручча, Астрашыцкі раён, Меншчына).

Калі ў мінулым годзе прыехалі ў нашу вёску прадстаўнікі з раёну праводзіць перавыбары сельсавету і пачалі гаварыць аб вялікіх задачах і адказнасьці сяброў сельсавету, дык некаторыя сяляне аж рукамі разьвялі—як гэта можна справіцца з такімі абавязкамі!?.

Пачалі высоўваць кандытатуры. Высунулі і мяне. Пасьля галасаваньня—я аказаўся сябрам сельсавету.

Разыходзячыся з сходу сяляне гаварылі:

— „Ну, братка, выбралі, дык старайся працаваць, а то мала ня будзе. Заўсёды абараняй інтарэсы батракоў і бедннаты“.

За час сваёй працы комсамольская ячэйка ўжо тры разы заслухоўвала маю справаздачу. Праца прызнана здавальняючай.

Па маёй ініцыятыве ў хаце-чытальні пашырыўся аддзел літаратуры для моладзі. Дзякуючы гэтаму хлопцы перастаюць хуліганіць, і ідуць займацца ў чытальню.

Працуючы ў камітэце сялянскай узаемадапамогі я ўвесь час стараўся задаволіць патрэбы бяднейшага сялянства ў насеньні, грошах і інш.

Калі рабіў справаздачу прад сялянамі сваёй вёскі, дык ніхто мае працы ня ганіў, а выказваў падзяку.

Комсамолец Сьцяпан Сандовіч.

Разам з гушчамі сялян.

(Бешанкавіцкая сельячэйка, Віцебшчына).

Бешанкавіцкая сельячэйка комсамолу пачала апраўдываць сваё званьне „сельскай“, хаця яна і арганізавана ў мястэчку.

Сходы свае, а таксама вечары самадзейнасьці, сельячэйка выносіць у розныя пункты сельсавету, каб паказаць сялянам сваю працу і ўцягці больш моладзі ў комсамол.

Пасьля невялічкай працы ў вёсцы Мамейках 10 хлапцоў падалі заявы аб паступленьні ў комсамол, з якіх 2—батракі, астатнія бедн яки.

Ячэйка карыстаецца добрым аўтарытэтам сярод сялянства, сяляне просяць каб комсамольцы часьцей заглядвалі ў іх вёску. Калі патрэбна дапамога ў працы ячэйкі—дык сяляне вельмі прыхільна адгукваюцца на гэта.

З усіх ячэек раёну, Бешанкавіцкая сельячэйка КСМ зьяўляецца лепшай і самай аўтарытэтнай сярод сялянства.

Чырвоны.

Канкрэтнай працай зьнішчаем недахопы.

(Несяцкая ячэйка ЛКСМБ, Клічаўскі раён, Бабруйская акр.)

У 140 нумары „Чырвонай Зьмены“ ў артыкуле тав. Галавача было адзначана, што Несяцкая ячэйка, амаль што не вядзе гаспадарчай працы, „выносіць пастановы пачыніць дарогі, масты і не пачыніла іх“.

Праўда, такое зьявішча мы мелі. Нават усе комсамольцы добра не разумелі карысьці гаспадарчай працы, комсамольцы нічым не адрозьніваліся ад другіх.

Цяпер ужо ў нас шмат новага, шмат выжыта недахопаў.

На адным агульным сходзе ячэйкі ўсе комсамольцы выносяць пастанову—засадзіць комсамольскі пітомнік і ў вызначаны дзень усе зьявіліся на работу, абгарадзілі вучастак, пітомнік закладзен і засеяна больш 600 штук яблынь. Таксама ячэйка адбудавала дарогу, якая йдзе ў м-ка Клічаў.

Таксама маем прыкладнасьць комсамольцаў у вядзеньні сельскай гаспадаркі.

Комсамолец пасёлку Плоскае. Каваленак Янка пабудаваў сабе дзьве кармушкі, таксама па ініцыятыве яго і др. комсамольцаў увесь пасёлак абсаджан бярозкамі.

Комсамолец Дубінін Уладзімер пры пабудаваньні новага хлява ўгаварыў старэйшага брата уцяпліць будыніну. Брат згадзіўся і хлеў пабудаван па новаму, каровы ўжо ў ім „дрыжыкі не прадаюць“.

Зразумела гэтай працы яшчэ вельмі мала, але-ж нельга забывацца, што гэта першыя дасягненьні канкрэтнай працы.

Мота Кацнельсон.

Не за страх, а за сумленьне.

(В. Ліхінічы, Круглянскі р., Аршаншчына).

Ужо некалькі месяцаў, як актыўны комсамолец Ліхініцкай ячэйкі Ф. Маляванаў служыць лясным вартаўніком у Цяцерынскай дачы.

Чэсна і аддана ахоўвае ён народнае дабро, ня лічыцца ні з сватам, ні з братам.

За невялікі час працы тав. Маляванаў зарабіў давер'е да сябе з боку лясной адміністрацыі і лічыцца найлепшым працаўнікам.

Некаторыя сяляне, што прывыклі пры ранейшых вартаўніках за ўзяткі вазіць лес, хацелі спакусіць і Маляванава, але наш комсамолец не забыўся пра сваё Ленінскае званьне, адкінуў усякія чорныя заманкі і чэсна служыць на карысьць працоўных.

З тав. Маляванава трэба браць прыклад многім комсамольцам—тэхнічным працаўнікам.

Мішуха.

„Чырвоная Зьмена“ кліча да працы!

* * *

(Вёска Мікіціна, Лядцянскі р., Аршаншчына)

Мікіціна—самая цёмная вёска ў нашым раёне. Моладзь апрача боек, картаў, выпівак—другім нічым не займаецца.

Пад бокам Мікіціны—Іскозы. Тут ёсьць комсамольская ячэйка. Але яна ў гэту цёмную вёску ніколі не заглядвае, не стараецца дапамагчы сваім братом асьвядоміцца.

Неадкладная задача Ізкозаўскай ячэйкі КСМ—павесьці працу ў в Мікіціна!

Сярога Кастрычнік.

* * *

(Сяло Аляксандрыя. Копысь, Аршаншчына)

Александрыйская ячэйка ЛКСМБ у апошнія часы чуць дыша, чуць жыве.

А на выгляд—ячэйка не ячэйка, а раёні 55 чалавек. Гэта вам ня хунт ізюму.

Комсамольцы ходзяць, як сонныя і ніяк ня могуць прыбіцца да працы.

Чакамінскі.

Недахопы—на мушку!

○ Рудзенскай ячэйцы комсамолу Менскай акругі есьць хлопцы з весак, што знаходзяцца ад гэтай станцыі верст за 7. Часта зьбіраюцца комсамольцы на сход, а сход і не адбудзецца. „Пакаціліся“ дамоўкі да хаты, вакліваючы бюр .

Дзіўны.

○ Копыльскі сельска-гаспадарчы гурток (Случчына) мабыць адпачывае для летняй працы бо цяпер занятка[ў] яшчэ і не распачынау. А мястэчковая моладзь прагне да сельска-гаспадарчай адукацыі.

Н. Лясны.

○ Комсамолец Барысаве[ц] з Рэокаўскай ячэйкі, Случчына заўсёды на пасяджэньні бюро крычыць аб падняцьці дысцыпліны, аб вынясеньні выгавору хлапцом, а сам—парвейшай маркі хуліган: вечна ходзіць гуляць у суседнія вёскі, дзе напіўшыся падымае на ногі ўсіх сялян.

Комсамолец.

○ —Дзе ты быў?

— На сходзе сялянскай ячэйкі.

— Ну што там чуў?

— Дзе там чуў? Чуць не аглух ад крыку!- так адзываюцца аб Копыльскай сялянскай ячэйцы.

Лявонка Бурэлом.
Мікітка Янушэвіч.

Гутаркі з дэлегатамі X з'езда КП(б)Б

(Праціяг. Пачатак—на 2-ай старонцы).

Парткіраўніцтва і парт'асяродак.

(Бабруйская організацыя КСМ)



Тав. Хількевіч.

Асабліва трэба зазначыць рост парт'асяродку.

Калі мы возьмем склад акруговай парторганізацыі—то лічбы кажуць самі за сябе: ў 1925 г. партыйцаў-комсамольцаў (у парторганізацыі) было 234—16 проц., а ў 1926 г.—540 чал.—25,6 проц., павялічэньне на 9,6 проц. За 1926 г. парторганізацыя вырасла ўсяго на 787 чал., з іх комсамольцаў 428—54,4 проц.

Конфэрэнцыя зазначыла, што рост парт'асяродку (за выключэньнем адзінічных выпадкаў) па яго якасьці быў справядлівы і нормальны: усяго (за 1926 г.) ўступіла ў партыю 428 комсамольцаў з іх рабочых 45,8 проц., парабкоў—3,3 проц., сялян—36,2 проц., служачых—12,9 проц., іншых 1,8 проц. У суадносінах да комсамольскай організацыі ў 1925 г. парт-асяродак складаў 6 проц. а ў 1926 г. —9,3 проц., павялічыўшыся на 3,3 проц. ня гледзячы на тое, што быў значны рост комсамолу (прынята у КСМ за 1926 г.—2239 ч.).

Мы маем павялічэньне партасяродку ў складзе кіруючага актыву як напрыклад: РК з 56,2 проц. стала 66,7 проц., сакратароў ячэек в 30 проц. стала 48,1 проц. і г. д.

Наогул палепшылася і ўзмацнілася парткіраўніцтва але па ўсіх напрамках асабліва па лініі камітэтаў, нельга абыйсьці таго факту, калі партыйцы-комсамольцы лічаць сябе «вялікімі людзьмі» нежадаюць працаваць ў комсамоле, незразуменьне узаемаадносін між комсамольцамі і партыйцамі, выпадкі дробнай апекі і формальнага кіраўніцтва з боку партячэек,

Вопыт Рэчыцкай організацыі.



Тав. Малікін.

З 2.388 комсамольцаў Рэчыцкай організацыі—партыйцаў налічваецца 143 чал. Гэты процант у зьвязку з прызывам 1904 году ў Чырвоную армію, крыху зьнізіўся.

Акруговая партыйная організацыя займаецца пытаньнямі партыйнага кіраўніцтва над комсамолам. І выходзячы з дырэктыў партыі, райкомы партыі пачалі займацца прапрацоўкай асобных пытаньняў комсамольскай працы на сваіх пасяджэньнях.

Дзякуючы гэтаму, адчуваецца вялікі інтарэс з боку асобных партыйцаў,—да комсамольскай працы свайго сяла.

За лік вясковых комсамольцаў узрост парт'асяродку ідзе слаба. Гэта тлумачыцца слабым культурна-політычным разьвіцьцём комсамольцаў.

Партыйнае кіраўніцтва праводзіцца праз партпрымацаваных. Аднак ёсьць такія комсамольскія ячэйкі, у вёсках якіх няма партыйнай ячэйкі. Гэта робіць належны адбітак на партпрацы.

І ў тых ячэйках, дзе няма парт'-прымацаваных—адсутнічае партыйнае выхаваньне комсамольцаў, недастатковае разуменьне політыкі партыі ў вёсцы. Яшчэ гэтаму часам спрыяе і тое, што іншыя комсамольцы. Пераведзеныя ў партыю, пачынаць адрывацца ад комсамольскага жыцьця.

Былі нават і такія выпадкі, калі хлапцы пераведзеныя ў партыю, лічылі сябе дастаткова „аўтарытэтнымі“, каб пазьбегчы ад удзелу ў комсамольскай працы.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ атрымоўвае шмат паведамленьняў аб тым, што некаторыя ячэйкі ЛКСМБ не здавальняючы праводзяць працу, што хлопцам надаядае „бегаць“ за сябрамі бюро ячэйкі прапытваючы пра агульны сход, пра тое ці іншае мерапрыемства організацыі.

Напрыклад, комсамольцы Рудзенскай ячэйкі, Сьмілавіцкага раёну у вольны час ідуць за 7 вёрст у Рудзенск, каб пачуць у ячэйцы навіны, каб навучыцца чаму небудзь карыснаму. А што яны прышоўшы атрымоўваюць?--Да. паснуюць па станцыі, чакаючы сакратара, пазяюць удоваль, ды ні з чым вяртаюцца да хаты.

Гэта хіба не пасыўнасьць бюро ячэйкі?

Зусім іншы малюнак працы мы маем у тых ячэйках, дзе вядзецца праца, а не адбываньне некай абавязковай, яшчэ мо' прыгоннай, павіннасьці, дзе комсамольцы жывуць працай ячэйкі, бо яна ім дае шмат карысьці, вучыць гаспадарыць, вучыць, як піша „Комсамольская Праўда“, як лепш жыць.

Такіх ячэек мы маем досыць шмат. Такія ячэйкі прыносяць вялізарную карысьць сялянам сваёй вёскі, будаўніцтву раёну, Савецкай дзяржаве ў цэлку.

Чаму Палёнкаўская ячэйка, Горацкага раёну, карыстаецца пашанаю ва ўсёй Аршанскай акрузе?--Таму, што яна ў кут свае працы ставіць канкрэтную, неабходную для сёнешняга дню справу. Яе піонэрскі атрад зьяўляецца прыкладным у раёне таму, што вызначныя цікавыя і карысныя моманты ў працы--піонэрамі праведзены ў жыцьцё бацькі бачаць, як іх дзеці навучаюцца ў атрадзе неабходнаму для „смышлёнай“ працы.

Нашым ячэйкам нельга гнацца за ўсім, за ўсімі кампаніямі і нічога не рабіць. А такіх „залётных ячэек“ мы маем досыць жмат. Лепш менш прыняць рэзолюцый, але каб гэтыя рэзолюцыі мелі выключна практычны характар, каб праведзеньне іх у жыцьцё хвалявала радасьцю кожнага комсамольца, кожнага маладога сьвядомага хлапца, кожную дзяўчыну.

З. ЖОРАЎСКІ.

„Залінейная“.

Гомельскія організацыі комсамолу знаёмяць комсамольцаў Беларусі са становішчам іхняй працы. Першай дае справаздачу „Залінейная“.

Назву „залінейная“, наша організацыя атрымала таму, што раён, які абслугоўваецца ёю, заселены амаль выключна чыгуначнікамі, і знаходзіцца за лініяю чыгункі. Гомельскі чыгуначны вузел сам па сабе даволі буйная экономічная адзінка. Агульны лік рабочых і служачых 6 800 чалавек, з якіх 902 чалавекі моладзі з якіх комсамольцаў 789 асоб

Па соцыяльнаму складу комсамольская організацыя такая: рабочых—628 чалавек. служачых—51, сялян—37, батракоў—7 і 1 саматужнік. Такім чынам па ўнутранаму складу, яе трэба расцэньваць як выключна рабочую.

Партасяродак.

Важнейшым фактарам, які забясьпечвае ўнутраную моц ячэек—зьяўляецца партыйнае ядро. Становішча ў гэтых адносінах вызначаецца наступнымі лічбамі: на 1-ае студзеня 1927 году ў організацыі налічваецца 144 чалавека сяброў і кандыдатаў партыі, што складае 19,7 проц. ад усёй організацыі [процант значна зьнізіўся ў выніку ўходу ў армію комсамольцаў 1904 году нараджэньня).

Ячэйкі «залінейнай».

Усяго ячэек у раёне 13, з якіх: вытворчых—4, паўвытворчых—2, савецкіх—1, школьных — 6, з якіх 5 соцвых і 1 профасьветы.

Як на характэрнай з вытворчых ячэек—можна спыніцца на колектыве галоўных майстэрань. Гэты колектыў складаецца з 5 цэхавых ячэек.

За вытворчасьць працы!

Кампанія падняцьця вытворчасьці працы знашла свой адбітак сярод комсамольцаў і моладзі. Мы маем значнае памяншэньне прагулаў з боку моладзі па галоўных майстэрнях, напрыклад, гэта выявілася ў наступных лічбах: да кампаніі аб падняцьці вытворчасьці працы—прагулы з боку моладзі па цэхам, у працягу месяца ў сярэднім вызначыліся ў ліку 85 гадзін. А ў апошні час гэтая лічба зьнізілася да 12 гадзін.

Такое зьявішча можна адзначыць і ў галіне памяншэньня спазьненьняў; моладзь акрамя таго стала шчыра адносіцца да сваіх абавязкаў у брыгадах. Часткова гэтыя вынікі тлумачацца яшчэ і асабістай зацікаўленасьцю моладзі ў падняцьці вытворчасьці і мерамі адміністрацыйных узысканьняў.

Удзел моладзі у падняцьці вытворчасьці па другіх лініях (вытворчыя камісіі і нарады) яшчэ слабавата і тут організацыі належыць зрабіць многае.

Культурнамасавая праца.

У галіне культурна-масавай працы Залінейнага раёну Гомельскай організацыі КСМ, ячэйкі бяруць курс на больш поўнае абслугоўваньне комсамольцаў і моладзі, імкнучыся аднačасова дасканальней зразумець зьмест форм з запатрабаваньнямі масы моладзі. У гэтых адносінах можна адзначыць чыткі і гутаркі, якія праводзяцца рэгулярна, агульныя сходы моладзі, насьценныя сьветавыя газэты, фізвыхаваньне, вячоркі ячэек і нарэшце працу ў юнсэкцыі пры Цэнтральным Партпрофклюбе імя Леніна. Асаблівая ўвага з усіх гэтых форм заслугоўвае праца юнсекцыі, якая карыстаецца вялікай популярнасьцю сярод моладзі. Вячоркі юнсэкцыі праводзяцца рэгулярна два разы ў месяц і прыцягваюць да сябе ня менш 100-120 чалавек моладзі.

Усю організуючую ролю нясе на сабе невялікая група клюбнага актыву. Астатняя-ж маса зьяўляецца толькі гледачом. Для разьвіцьця фізычнай культуры ў раёне маюцца ў наліччы ўсе даныя. Нядаўна скончылася пабудова стадыёну і спортклюбу, якія па сваёй плошчы і абсталяваньню зьяўляюцца лепшымі ў Гомельскай акрузе.

Хворыя зьявы.

Да хворых зьявішч у організацыі неабходна аднесьці п'янства, хуліганства з боку асобных найбольш мала афармленых комсамольцаў. У апошні час, дзякуючы энэргічнай працы ячэек, гэтыя зьявішчы зьнішчаюцца, аднак, задача барацьбы з недысцыплінаванасьцю і антыбытавымі зьявамі павінна займаць у практыцы нашай працы найвіднейшае месца.

Асьвета рабочай моладзі.

У гэтым годзе мы маем некаторае павялічэньне ахопу комсамольцаў сеткаю комсамольскай адукацыі, а таксама індывідуальнай і групавой самаадукацыі. Палепшыўся падбор кіраўнікоў, склад наведваючых стаў больш сталым, усё-ж трэба сказаць, што ў некаторай частцы комсамольцаў няма дастатковай зацікаўленасьці ў політвучобе, што адбіваецца на акуратнасьці наведваньня, якое ў агульным нельга назваць зусім дастатковым.

Куды большая зацікаўленасьць моладзі да атрыманьня агульна-асьветных і спэцыяльных ведаў, гэтыя імкненьні здавальняюцца курсамі па павышэньню кваліфікацыі рабочай моладзі, школ ФЗУ, вячэрнымі школамі рабочай моладзі і вячэрнім рабочым тэхнікумам.

Можна спадзявацца, што організацыя, якая была ў працягу шэрагу гадоў на лепшым месцы ў Гомельскай губэрскай організацыі, займе адпаведнае месца ў Беларускай організацыі ЛКСМ.

Папенкоў.

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Колькі трэба навучацца у фабзавучы?

Згодна пастановы ВСНГ, Наркамасьветы і УсеЦСПС зьменены тэрміны навучаньня у фабзавучы.

У школах ФЗВ у металапрамысловасьці, пачынаючы з прыему вучняў 1926-27 г. — вызначаецца 3 хгодні тэрмін навучаньня. У тэкстыльнай прамысловасьці, пачынаючы таксама з прыему гэтага году—вызначаецца 2-хгодні курс навучаньня. У хэмічнай прамысловасьці для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых, у фармацэўтычнай прамысловасьці і у гумовай вытворчасьці—вызначаецца 2-хгодні тэрмін навучаньня.

Ва усіх астатніх галінах прамысловасьці пакуль, да спэцыяльнай пастановы, захоўваюцца раней вызначаныя тэрміны навучаньня.

Хто прыняты у ВНУ?

У выніку прыема ва усе ВНУ, рабфак і тэхнікумы у 1926 г. склад слухачоў, у параўнаньні з 1925 г., у зьвесных адносінах моцна зьмяніўся: процант іншых узрос з 36,2 проц., да 46,4 проц., процант рабочых зьнізіўся на 4,3 проц.; лік сялян зьнізіўся на 5,9 проц., процант партыйцаў зьнізіўся на 7,6 проц.

Амаль непрыкметна зьнізіўся процант комсамольцаў (на 0,3 проц.).

Зьніжэньне проценту рабочых, сялян, партыйцаў і комсамольцаў тлумачыцца тым, што у гэтым годзе упяршыню ужывалася частычная адмена камандзіровак, для усіх былі уведзены конкурсныя экзамены.

Процант паступіўшых жанчын у гэтым годзе — 22,5 проц. Па спэцыяльнасьцям жанчыны паступілі большай часткай у мэдыцынскія і пэдагогічныя ВНУ.

Цыфры прыему на рабфакі наступныя: на дзённых рабфаках рабочых з ліку прынятых у гэтым годзе аказалася 51,2 проц. (у параўнаньні з мінулым годам павялічаньне на 1 проц., сялян—10 проц. (зьменшэньне на 5 проц.) і іншых—8,8 проц. (павялічэньне на 3,8 проц.).

Усе павадыры павінны прайсьці мэдагляд

Згодна загаду Наркам Аховы Здароўя усе павадыры піонэрскіх атрадаў павінны прайсьці мэдагляд у рознага роду дыспансэрах і іншых лячэбных і профілактычных установах Наркам Аховы Здароўя.

Мэдагляд будзе праходзіць два разы у год: вясною і восеньню. Мэта медагляду — ахапіць дыспансэрамі павадыроў, вывучыць прычыны хваробаў сярод павадыроў і папярэдзіць узрост хваробаў на далейшы час.

Мэдагляд мае таксама мэтаю забясьпечыць лячэньне павадыроў у рознага роду дамох адпачынку, дыспансэрах і г. д.

Першы мэдагляд адбудзецца вясною гэтага году.

Быць добрым стралком— ваякай!

Стралковы спорт набывае усе большую і большую популярнасьць сярод рабочай і сялянскай моладзі. Трэба гэта імкненьне моладзі да стралковага спорту накіраваць у правільнае русло праз гурткі добра падрыхтаваных вайсковых стралкоў, тым больш, што распаўсюджваньне вайсковых ведаў і навыкаў сярод шырокіх колаў насельніцтва супадаюць з задачамі будаўніцтва тэрыторыяльнай арміі.

Комсамол праводзіў ужо у гэтым напрамку працу, але пакуль вынікі не яшчэ вельмі малыя.

У сучасны момант ЦК УсеЛКСМ у спэцыяльным лісьце мясцовым організацыям паказаў на неабходнасьць узмацненьня гэтай працы. Практычна неабходна прарабіць наступнае: разгарнуць сярод комсамольцаў шырокую вусную і пісьменную пропаганду стралковага спорту, устанавіць сувязь з стралковымі сэкцыямі Саветаў фізкультуры і прыняць актыўны удзел у іх працы, зьвязацца з масовымі організацыямі палаўнічых.

Мясцовыя камітэты павінны організаваць падрыхтоўку інструктароў з асяродзьдзя комсамольцаў, організаваць стралковыя гурткі пры клюбах, хатах-чытальнях, вардомах, школах ФЗВ, школах сялянскай моладзі, школах І і ІІ ступені і г. д. Для пакупкі дробнака-ліберная аружжа мясцовыя організацыі павінны будуць організаваць добраахвотныя зборы сярод моладзі.

Студэнтаў—у адзіную профорганізацыю.

ЦБ Пролетстудэнцтва ВССР распрацоўвае статут аб адзінай профэсыйнай організацыі.

Згодна палажэньню, у школах з лікам сяброў саюзу да 50 проц. агульнае колькасьці студэнцтва закладваюцца профкомы.

У школах-жа з меншым лікам профсаюзнага студэнцтва будуць утвораны студкомы.

Па думцы ЦБ, гэткая схема пабудавана профорганізацый у ВНУ і тэхнікумах значна упрашчае справу наогул і умоцніць адзіныя прынцыпы пры выбарах у арганізацыі.

Берагчы здароўе!

—У сакавіку г. году склікаецца усебеларуская нарада урачэй па мэдкантролю над фізкультурнікамі. Нарада працягнецца 5 дзен.

— У Варшаве організаваўся савет аховы здароўя дзяцей і падлеткаў, па прыкладу Менскага савету.

— Вышла з друку кніжка дактароў Дэкшэра, Смулевіча і Эзгорна, пад назвай «Рабочая Моладзь Беларусі», якая зьмяшчае матар'ялы мэдагляду моладзі у 1925 годзе.

— Народны камісарыят аховы здароўя падвёў вынікі працы вучастковых урачоў па мэдыцынскаму абслугоўваньню школ пры чым выявілася, што урачамі было зроблена 1382 наведваньне школ і праведзена 150 гутарак у школах.

Што цяпер на экране „Культуры“?

Лепшая кіно-фільма „Маці“.

Уся моладзь павінна бачыць яе!

У кіно „Культура“ зараз дэмонструецца адна з найлепшых фільм расійскай вытворчасьці пад назвай „МАЦІ“, сюжэт якой запазычаны з вядомай аповесьці пісьменьніка М. Горкага.

Аб гэтай фільме маюцца найлепшыя водгукі нашага друку.

І сапраўды: у карціне „МАЦІ“ мы бачым надзвычайна яскравы адбытак гэроічнай барацьбы расійскага пролетарыяту з царскім самаўладитвам. Масавыя сцэны рабочых дэмонстрацый, зьдзекаў царскай поліцыі над рэволюцыянэрамі і т. д., літаральна захапляюць гледача, робяць на яго вялікае ўражаньне.

Гэту карціну асабліва нёабходна паглядзець нашай рабочай моладзі, якая ня была сьведкай рэволюцыйных падзей, а толькі чула аб іх.

Рабочая моладзь Масквы, Ленінграду і іншых буйных цэнтраў адпаведным чынам ацаніла гэтую карціну. Апошняя ішла пры буйных зборах, прычым моладзь была галоўным наведвацелем кіно-тэатраў.

Рабочая моладзь Менску і іншых гарадоў Беларусі таксама павінна бачыць гэту фільму.

Організуйце колектыўныя наведваньні кіно-тэатраў у часе дэмонстрацыі „МАЦІ“, па прыкладу ячэйкі Працасьветы, якая робіць гэта ў суботу 8-га студзеня.

Запытаньні і адказы

ЗАПЫТАНЬНЕ № 740. (Залескага). Ці мае права фарпост устрымацца ад перадачы піонэра у Комсамол, калі агульны збор піонэр-атраду рэкомэндаваў яго?

АДКАЗ. Фарпост, наогул, ня мае права рэкомэндаваць ці устрымацца ад рэкомэндацыі таго ці іншага піонэра. Гэта справа піонэр-атраду.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 741. (Коды Ш.) Ці можна хлапцу з мястэчка, ці з вескі паехаць у горад працаваць на фабрыку і як гэта зрабіць?

АДКАЗ. У сучасны момант паступіць на фабрыку працаваць цяжка з прычыны вялікага беспрацоўя.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 742. (В нікава). Ці хутка газэта «Чырвоная Зьмена» будзе выходзіць штодзенна?

АДКАЗ. У працягу 1927 году такіх пэрспэктываў няма.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 743. (В.) Калі распушчаюць профтэхшкольцаў на канікулы?

АДКАЗ. Профшкольцаў адпусьцяць 25 га студзеня г. г.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 744. (С. З.) Ці мае права камісія на абкладу вучнаў платай адысьці ад цыркуляру, які прыслан ад Акрана?

АДКАЗ Ня мае права.

ЗАПЫТАНЬНЕ № 745. (В. Мейлаха). У ведамым з нумароў «Чырвонай Зьмены» была надрукавана, што адрас часопісі «Беларускі Піонэр» Менск, Галоўліт, Інтэрнацыянальная 14, а у самай часопісі надрукавана —Менск, Наркамасьветы. Каму верыць?

АДКАЗ. Рэдакцыя часопісі «Беларускі Піонэр» цяпер пераехала па адрасу: Менск, Галоўліт, Інтэрнацыянальная 14. У часопісі стары адрас па тэхнічным прычынам быў надрукован памылкова.

Дзе будуць адпачываць?

Зімовыя дамы адпачынку

У мінулым годзе па БССР існавалі 4 зімовых дамы адпачынку на 150 ложкаў.

Дэфіцытны бюджэт страхавых органаў не дае магчымасьці у 1926-27 г. утрымоўваць усе 150 ложкаў.

Вось таму Савет Сацыял. Страх. БССР пастанавіў адчыніць з экономіі замест 4-х дамоў адпачынку толькі 2: адзін з іх у Віцебску (на 4 акругі), а другі у Менску (на 6 акругаў).

Месцы у дамох адпачынку будуць запаўняцца па пуцеўкам урачэбна-кантрольных камісій.

Профтэхнічныя курсы сябе апраўдалі.

Галоўпрофасьветы разам з ЦСПСБ і гаспадарчымі органамі праводзіць у жыцьцё пастанову аб організацыі пры прадпрыемствах профтэхнічных курсаў рабочай моладзі.

Пакуль што адчынены гэткія курсы на шкляным заводзе «Пролетары» (у Менску) і для металістых (у Менску і Віцебску).

Вучэбная частка на курсах апраўдала сябе на столькі, што галоўпрофасьветы у бліжэйшы час утварае яшчэ шэраг гэткіх курсаў пры прадпрыемствах Віцебску і Бабруйску.

У тры радкі:

○ Клубны сэмінарый пры ЦСПСБ організаваўся гэтымі днямі для перападрыхтоўкі загадчыкаў клюбаў і асобных клубных актывістых.

○ Яўрэйская юнацкая земляробчая калёнія у Менску організуецца на сродкі «ОЗЭТ» у пачатку вясны 1927 г.

○ Лыжная станцыя адчынілася у Гомлі. Пры ёй абсталеван каток.

○ Першы у БССР пэдагагічны музэй адчыніўся 1 студзеня у Менску пры цэнтр. доме працаўнікоў асьветы. Намечана утварэньне акруговых філіялаў музэю.

○ Трохдзенькі т-ва «Прэч непісьменнасьць» дау па Менску і Віцебску скарбонachнага збору каля 700 руб. Лік выпускнікоў лікпунктаў у гэтых дні дасягае 1500 чал.

○ Белавіяхім набывае новыя камплекты дыяпазытываў; кіно стужак з жыцьця авіяхіму. Таксама набываюцца падручнікі для сялянства.


○ Дзела інтэнсыўнай барацьбы з хуліганствам у Менску адчыняецца на 3 месяцы спэцыяльная судовая камэра.

○ Новы зборнік вершаў «Вежа» Ал. Дударя выдадзен у друк ЦБ «Маладняк».

○ 400 новых экспонатаў аб быце вескі паступіла у Белдзяржмузэй. Усяго іх налічваецца у этнографічным аддзеле музэю больш 2.000

Нарада па культпрацы сярод гарадзкой моладзі.

Такая нарада склікаецца у пачатку лютага 27 году ЦК УсеЛКСМ разам з Культаддзелам УсеЦСПС. На нарадзе стаяць наступныя пытаньні: аб узаемаадносінах КСМ з профорганамі у справе пастаноўкі культпрацы сярод моладзі, аб клюбнай працы сярод моладзі, аб падрыхтоўцы да летнай працы, аб унеклюбнай культпрацы і г. д.



Памылкі.

У 150 нумары «Чырвонай Зьмены» на другой старонцы у падвале 5-й калёнкі у першым абзацы зроблена памылка.

Надрукована: «На вестках якія маюцца, гэтыя законы даюць правы, якія ангельскія рабочыя мелі год таму назад».

Трэба чытаць: «На вестках якія маюцца, гэтыя законы даюць правы, якія ангельскія рабочыя мелі 50 год таму назад».

„Помста“ вуглем па сьцене...

У Менскіх бяспрытульных

Пры ўваходзе ў памяшканьне дзеткамісіі Менскага Акрвыканкому кідаюцца ў вочы няцэнзурныя надпісы, намалёваньня алоўкам і вуглем. Тут-жа стаіць група бяспрытульных з 5 чалавек.

На мае запытаньне-хто гэта „так прыгожа намалеваў“ маленькі абадраны хлопчык бойка адказвае:

— Гэта наша шпана пастаралася!

Аказваецца, што бяспрытульныя такім чынам «мсьцяць» дзеткамісіі за тое што апошняя, па іх думцы не зьвяртае ўвагі на іх становішча.

У сучасны момант на вучоце камісіі маюцца ўсяго 30 дзяцей. Сапраўная колькасьць бяспрытульных значна перавышае гэты лік. Дакладныя весткі аб колькасьці бяспрытульных высьвятлацца пасьля правядзеньня вынікаў усеагульнага перапісу.

Дзецям, якія маюцца на вучоце камісіі, аказваецца дапамога. Адны з іх атрымліваюць штодзённа абеды, другім даецца невялікая грашовая дапамога і г. д. Таксама накіроўваюць дзяцей на Біржу Працы. За апошні час удалося некалькіх дзяцей накіраваць у дзіцячыя дамы.

Значная частка бяспрытульных займаецца пакражамі. Над такімі ўтвараюцца суды, якія маюць, галоўным чынам, выхаваўчы характар.

Недахоп сродкаў не дазваляе дзеткамісіі дастаткова шырока разгарнуць працу. Але ўсё ж такі паступова зьмяншаецца ў Менску лік бяспрытульных.

Я. Зэльцар.

Крывое люстра.

Ой, ратуйце!

Бывала стары кажа свайму сыну:

— Хочаш, каб у цябе была „цэлая галава“,—дык пайдзі на вечарынку!

На вечарынцы скокі да ўпаду, п'янка да разбою, дыму як у дрэннай лазьні, лаянкі—колькі хочаш!..

Там сустрэнеш маці, якая даўно ўжо памёрла, успомніш аб прасьвятой багародзіцы, аб якой даўно запамятваў, ну, наогул, усё там знойдзеш і аб усім успомніш.

У чым справа—спытае чытач,—на тое яна і вечарынка, каб усё там знайсьці!

Але паслухайце: у горадзе Бабруйску, на рагу Соцыялістычнай і Комсамольскай вуліцы, ў двухпавярховым будынку за прыгожай шыльдай знаходзіцца клюб.

У гэтым клюбе многа пакояў: чытальня, бібліотэка, буфэт, шашачная, вялікая заля для пасяджэньняў.

Бывае часам выступае „Сіняя Блуза“. Многа крычыць аб рацыяналізацыі часу, вытворчасьці, клюбнай працы і інш. і інш.

І вось, браткі мае, калі вы хочаце, каб вашыя рэбры альбо астатнія суставы вашага організму былі „цэлыя“, дык, калі ласка, зайдзеце ў гэты клюб.

Там вечарамі ў калідорах, на ступеньках усходаў і ў іншых мясцох сабіраецца цэлая армія маладога народу.

Аб чым яны толькі там не гавораць, каму яны толькі не падстаўляюць ножку, каго яны не прыдушылі, хто ад іх не закрычаў нямым голасам: „ой, ратуйце“!

Скажэце—калі там было сьвежае паветра, калі там хоць адзін шахматысты, альбо прыхільнік шашачнай гульні мог вольна дагуляць сваю партыю.

Не, гэтага прыгожага часу чакаюць толькі пры поўнай пабудове соцыялізму!

Ну, што вы! Ніколі не паверу гэтаму, бо паміж пабудаваньнем соцыялізму і прывядзеньнем ў парадак клюбу—вялікая розьніца. Думаю, што клюб можна прывясьці ў парадак і да пабудовы соцыялізму!

Але куды тады дзенуцца тыя, якія цяпер „працуюць“ у калідорах?

Дзе? Месца хопіць і ім. На гэта ёсьць чытальня, у якой народу мала. На гэта ёсьць юнсэкцыі пры клюбах, якія не працуюць. Ого-го—месца хопіць, дзе прыкласьці актыўнасьць, трэба толькі падумаць!

З вялікай надзеяй думаю, што у Бабруйску знойдзецца каму падумаць над гэтым, але думаць мала; трэба зрабіць што небудзь.

МІКОЛА КРАЖ.



ПА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ.

Комсамол на пераломе. Зборнік артыкулаў. „Молодая Гвардия“. 1927 г. ст. 189. Ца на 75 кап.

Чатырнаццаты зьезд партыі, абгаварваючы пытаньне аб моладзі, сформуліраваў задачу комсамолу на бліжэйшы перыяд часу, як задачу ажыўленьня усей саюзнай працы і прыстасаваньня яе зьместу да новых патрабаў моладзі.

Пэрыод часу, у які будзе праходзіць гэта ажыўленьне—названы зьездам «пераломным момантам» у разьвіцьці комсамолу.

У чым заключаецца «пералом» у разьвіцьці комсамолу? Некаторыя таварышы стільны ацэньваць яго, як паварот ад ней кага наісьнуючага крызісу да новага пад'ёму. Гэта няправільна. Крызіс мог-бы выйсьці, калі-б партыя і Саюз своечасова не улічылі тое расхаджэньне між мэтадамі працы саюзу і патрэбамі моладзі, якое пачало выяўляцца у 1925 годзе.

Да гэтага часу моцна узрасла грамадзка палітычная і культурная актыўнасьць рабоча-сялянскай моладзі. Супольна з палепшэньнем матэр'яльнага дабрабыту падымаліся запросы, вырасталі патрэбы, здаволіць якія можна была толькі у корані зьмяніўшы мэтоды і формы саюзнай працы, выкарчаваўшы з яе шаблон і казеншчыну і замяніўшы іх жывой і конкрэтнай справай.

Усе гэта не так легка, усе гэта патрабуе шмат часу і вялізарнага напружаньня усіх комсамольскіх сіл. Над гэтай цэнтральнай проблемай працы комсамолу не дарма б'ецца сёньняшняя саюзная думка.

Шэраг артыкулаў, сабраных у гэтай кнізе, цалкам прысьвечаны гэтаму пераломнаму пэрыоду. У зборнік увайшлі артыкулы і прамовы т. т. Бухарына, Чапліна, Мільчакова, Баумана і іншых кіраўнікоў партыі і саюзу.

Зборнік вельмі неабходны кожнаму саюзнаму працаўніку. На некаторы час ён павінен стаць свайго роду настольнай кнігай, якая дае адказы на шэраг хвалюючых пытаньняў.

Я.

„Чырвоны Сейбіт“ №№ 4 і 5. сьнежань 1926

Перад намі два апошнія нумары двухтыднёвага літаратурнага дадатку да «Беларускай вескі».

Той факт, што «Чырвоны Сейбіт» вышаў ужо пятым нумарам «сьведчыць» што часопіс выдаецца рэгулярна і больш-менш ўсталявалася. Прыемна адзначыць, што у часопісі прызначанай для сялянства, прымаюць удзел нашы лепшыя літаратурныя сілы.

І сапраўды: на старонках „Ч. С.“ друкуюцца такія пісьменьнікі і поэты, як Колас, Купала, Крапіва, Трус і інш. Побач з гэтымі у часопісі друкуюцца творы маладых, пачынаючых поэтаў.

Першыя нумары «Чырвонага сейбіту» выклікалі суворую, але у асноўным, правільную крытыку на старонках нашага пэрыодычнага друку («Звезда» і «Сав. Беларусь»). Урэшце, сама рэдакцыя прызнае факт што „хібы і недахопы маюцца“.

Але апошнія (4 і 5) нумары сьведчаць, што крытыка дапамагае «Ч. С.» стаць на больш правільны шлях у параўнаньні з мінулымі нумарамі.

Артыкул т. Адамовіча, зьмешчаны у чацьвертым №, дае аналіз і ацэнку нашай сучаснай літаратуры, намячае яе далейшыя шляхі і задачы.

Як заўседы выклікае сьмех чытача, Крапіва сваімі гумарыстычнымі апавяданьнямі і вершамі.

З астатняга літаратурнага матэр'ялу вартта адзначыць «сьцежкі»—вельмі характэрны дая П. Трус верш, прыгожую легенду Ів. Барашкі з старадаўняга мінулага, вершы Хлебкі, ды інш.

Трэба адзначыць што у часопісі мяецца багаты бібліографічны аддзел (№ 4), які адгукаецца на апошнія навінкі беларускай літаратуры.

Агульнае-ж уражаньне ад апошніх нумароў «Чырвонага Сейбіта» можна фармуляваць каротка:

«Чырвоны Сейбіт» пачынае займаць займае не апошняе месца сярод нашых літаратурных выданьняў.

Чытач.

«Смена» Часопісь рабочай моладзі № 23. Сьнежань 1926 г. Выд. „Молодая Гвардия“.

— „Вось добрая часопісь“!—мімаволі вырываецца калі чытаеш «Смену».

Зьмест часопісі багаты і цікавы.

Вельмі жыва і яскрава апавядае жыцьці і працы Леаніда Б рысавіча Красіна перадавы артыкул часопісі.

Апавяданьне Дарагамілова „Тайна двоичного исчисления“ прывучае моладзь з цікавасьцю адносіцца да задач, шарад і г. д., таксама асьвятляе куток нашага клюбнага жыцьця.

На ўсім удалым трэба лічыць апавяданьне М. Пршвіна „Сердце зимы“.

У канцы гэтага апавяданьня аўтар зьбіўся на агульныя выразы і ахвіа развыажаньні. А між тым мэта апавяданьня заслугоўвае увагі; гэта—азнаеміць моладзь з законамі прыроды, зацікавіць яе навуковымі пытаньнямі.

Такую-ж мэту праследуюць артыкулы профэсара Бардзіна «Из тьмы веков», які кажа аб вывучэньні пойнікаў старажытных поудня СССР і Мелік Пашаева „О старине“.

З грымасамі буржуазнага спорту, яго агоўнымі і шкоднымі бакамі, якія калечуць большую частку займаючыхся, знаёміць артыкул Громава. Артыкул забясьпечан шчікавымі малюнкамі і фотографіямі.

Артыкул Нэрвава аб сям'е сучаснага мінулага і будучага, высьвятляе пытаньне у новых, сучасных формах шлюбу.

Часопісь легка чытаецца.

Але на ўсім удалым, як мне здаецца выпускаецца ўвагі рэдакцыяй курс на выявленае высьвятленьне проблем навуковага характару.

У кожным нумары добра даць два—тры навукова-популярных артыкулы, а астатняе месца трэба аддасьці бытавым артыкулам, апавяданьням, вершам і г. д.

Трэба і надалей, даваць аддзел «Беседы врача», які надзвычайна цікавіць усе чытачы.

Часопісь «Смену» мы вельмі раім рабочай моладзі.

Р. Гольдзін.

Усім ячэйкам Менску і прадстаўнікам у ЦП профсаюзаў

Менакругком ЛКСМБ паршшу да 25-га студзеня г. г. правесьці вучот рабочай і служачай моладзі, а дзеля гэтага усім ячэйкам неабходна, пад адказнасьць сакратара, вылучыць на аднаму таварышу (пажадана экономпрацаўніка, альбо таварыша знаёмага з ...) і прыслаць яго на нараду, якая адбудзецца у суботу 8-га студзеня, 7 й гадз. ўвечары, у памяшканьні клюбу «КІМ», белабанішы што ад саюзнага дню.

Прадстаўнікі у ЦП профсаюзаў павінны зьявіцца на нараду са сьпісамі фабзаўкому.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІК, А. КУРЦІК

Галоўлітбел № 23056 2-ая Дзярждрукарня БДВ.